ажыццяўляе параўнальны аналіз іх розных тыпаў. Традыц. бел. культуру лінгвісты, этнографы, гісторыкі і фалькларысты пачалі сістэматычна даследаваць у 19 — пач. 20 ст. (П.А.Бяссонаў, У.М.Дабравольскі, М.В.Доўнар-Запольскі, Я.Ф.Карскі, А.Г.К.Кіркор, Е.Р.Раманаў, І.А.Сербаў, А.К.Сержпутоўскі, М.Федароўскі, П.В.Шэйн і інш.) У 1-й трэці 20 ст. ўпершыню з'явіліся культуралагічныя працы «Беларускае адраджэнне» М.Багдановіча (1915), «Адвечным шляхам» І.У.Канчэўскага (1921), «Заходне-русізм» А.Цвікевіча (1929) і інш. У працах філосафаў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў і сацыёлагаў 2-й пал. 20 ст. даследаваліся розныя аспекты станаўлення бел. культуры, паглыблення яе ўздзеяння на фарміраванне маст.-эстэтычных каштоўнасцей, нац. самасвядомасці бел. народа. К. як навука, якая вывучае заканамернасці развіцця і функцыянавання культуры, яе структуру і дынаміку, узаемасувязі і ўзаемадзеянне з інш. сферамі матэрыяльнага і духоўнага жыцця, сфарміравалася толькі ў 1980-я гг. У гэты перыяд бел. навукоўцамі ажыццяўлялася мэтанакіраванае фундаментальнае даследаванне сукупнасці культ. з'яў і працэсаў у грамадстве. У 1990-я гг. ў ВНУ, ін-тах павышэння кваліфікацыі кадраў ствараліся кафедры К., у навуч. працэс уводзіўся культуралагічны курс. У наш час К. ўключана ў агульную сістэму навук. ведаў, валодае ўласным прадметам даследавання і канкрэтнымі метадамі. У Беларусі даследаванні ў галіне К. праводзяць А.А.Гарбацкі, П.Р.Ігнатовіч, М.І.Крукоўскі, І.Я.Левяш, У.Ф.Мартынаў, І.В.Марозаў, В.У.Пазднякоў, І.Д.Разэнфельд, У.П.Скараходаў, А.І.Смолік, І.Я.Шыршоў і інш.). У Бел. ун-це культуры і мастацтваў, Бел. ін-це праблем культуры, БДУ, Рэсп. ін-це вышэйшай школы БДУ, Гродзенскім ун-це створаны навук. цэнтры, дзе праводзяцца даследаванні па К. Да пач. 21 ст. сфарміраваліся такія галіны культуралагічных ведаў, як гісторыя культуры, тэорыя культуры, філасофія і сацыялогія культуры, культ. антрапалогія, прыкладная К. і інш. Сучасныя бел. культуролагі даследуюць заканамернасці развіцця і функцыянавання культуры, яе марфалогію і дынаміку, этнічныя і духоўныя асновы культуры і быцця чалавека, дыялектыку ментальнасці і нац. культуры, узаемадзеянне розных культур і цывілізацый свету. Вядзецца праца па даследаванні базавых кампанентаў каштоўнасных арыентацый асобы ва ўмовах трансфармацыі сацыякульт. асяроддзя; аксіялагічных і структурных асноў маст. культуры; пытанняў генезісу, тыпалогіі і механізмаў самазахавання нематэрыяльнай традыц. культуры; ролі і месца ў структуры культуры этыкі і рэлігіі; механізмаў сацыякульт. рэгуляцыі дэмаграфічных паводзін суб'ектаў посткатастрафічнага соцыуму; культ. палітыкі ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства. Навукоўцы Бел. ін-та праблем культуры сумесна з культуролагамі і мастацтвазнаўцамі Цэнтра даследаванняў бел. культуры, мовы і л-ры НАН Беларусі, Бел. акадэміі мастацтваў, Бел. ўн-та культуры і мастацтваў, Бел. акадэміі музыкі распрацоўваюць канцэптуальныя асновы і праграмы развіцця нар. творчасці і прафес. мастацтва, інфармацыйнай інфраструктуры, галін культуры, сістэму норм і прынцыпаў узаемадзеяння бел. культуры з інш. культурамі. Выдадзены аўтарскія і калект. навуч. дапаможнікі па К., тэорыі і гісторыі культуры, навук. даведнік «Культура Беларусі XI—XIX ст.» А.І.Смоліка (1998), энцыклапедычныя даведнікі «Сусветная культура. Ад старажытнасці да нашых дзён» (2001) і «Культуралогія» (2003) Э.С.Дубянецкага, «Помнікі сусветнай спадчыны» В.П.Кісяля (2-е выд. 2001) і інш.

*Літ.*: Смолік А.І. Беларуская культуралогія на мяжы стагоддзяў // Весн. Бел. дзярж. ўн-та культуры. 2002. № 1; Скараходаў У.П. Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі. Мінск, 2003; Кухто Л.К. Культуралогія — новая навуковая дысцыпліна ў Беларусі // Адукацыя і выхаванне. 2005. № 11; Мартынов В. Поиск своего пути // Бел. думка. 2006. № 1; Смолік А.І. Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты прыкладной культуралогіі // Веснік Бел. дзярж. ўн-та культуры і мастацтваў. 2010. № 1 (13); Сулимов В.А., Фадеева И.Е. Культурология — наука о смыслах // Вопросы культурологии. 2013. № 3; Докучаев И.И. Дифференциальная культурология и науки о культуре: проблема методологической дивергенции // Вопросы культурологии. 2013. № 6.

*А.І.Смолік.*

**КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ЭПОХА**, прамежак часу ў развіцці грамадства, які мае пэўныя характэрныя адметнасці стылю і форм культуры. Суб'екты К.-г.э. аб'яднаны пэўнай культ. агульнасцю: мовай, менталітэтам, спосабамі жыццядзейнасці, ідэаламі, ідэямі, стэрэатыпамі, традыцыямі, звычаямі і інш. У розных грамадскіх супольнасцях дадзеныя культ. агульнасці могуць праяўляцца па-рознаму. Напр., маст. стыль барока, уласцівы для эпох Адраджэння і Асветніцтва, у Беларусі спалучаўся з мясц. традыцыямі і заходнееўрап. уплывам і ўвайшоў у гісторыю як «віленскае барока». У гуманітарных навуках прынята вылучаць наступныя К.-г.э.: Антычнасць, Сярэдневякоўе, Адраджэнне, Асветніцтва. У эпоху Антычнасці ўзніклі многія феномены, артэфакты і агульначалавечыя каштоўнасці сучаснай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Адметнасцю эпохі Сярэдневякоўя (5—15 ст.) з'яўляецца яе хрысціянскі характар, вядомы тэацэнтрызм, надзвычайны традыцыяналізм, ідэйная інталерантнасць, сімвалізм і алегорыя, сінтэз некалькіх культ. арыентацый, функцыянаванне шэрагу субкультур. У мастацтве дадзенай эпохі дамінаваў стыль готыка. Найб. важнай асаблівасцю эпохі Адраджэння (14 — 1-я пал. 17 ст.) быў гуманізм, зварот да культ. здабыткаў і каштоўнасцей антычнасці, фарміраванне свецкай культуры. Вядучае месца ў стылісты-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ

цы займала барока. Прыярытэт асветы, навукі і розуму, узмацненне свецкіх пачаткаў у культуры характэрны для эпохі Асветніцтва (18 — 1-я пал. 18 ст.). Філасофія, музыка і тэатр з'яўляліся дамінуючымі відамі маст. культуры. Уплывовымі стылямі былі барока і класіцызм.

*Літ.*: Культура эпохи Возрождения и Реформации. М., 1981. Культура эпохи Просвещения. М., 1993. История мирового искусства. М., 1998. *Л.К.Кухто.*

**КУЛЬТУ́РНА-ГІСТАРЫ́ЧНЫ МЕ́ТАД** у літаратуразнаўстве, спосаб аналізу нацыянальных літаратур і асобных літ. твораў, якія ўспрымаюцца ў якасці своеасаблівага прадукту грамадскага жыцця і канкрэтных культ.-гіст. абставін развіцця народа. Паводле К.-г.м. адметныя рысы разнастайных маст. з'яў абумоўлены ўплывам найб. значных падзей сац.-культ. дзейнасці і маральна-духоўнага жыцця грамадства. У 2-й пал. 19 ст. былі сфармуляваны асн. прынцыпы метаду. Паводле іх спецыфіка любога маст. твора тлумачыцца «расай» (прыроджаным нац. тэмпераментам), «асяроддзем» (кліматычнымі і прыроднымі ўмовамі, сац. абставінамі) і «момантам» (уплывам нац. традыцый). У 20 ст. метад выкарыстоўваўся ў працах бел. літаратуразнаўцаў, этнографаў, фалькларыстаў (М.Доўнар-Запольскага, І.Замоціна, Я.Карскага і інш.). У сучасны перыяд у бел. літаратуразнаўстве часам прымяняюцца (разам з інш. метадамі навук. аналізу) асобныя метадалагічныя ўстаноўкі К.-г.м.

*Літ.*: Веселовский А.Н. Историческая поэтика. М., 1989; Замоцін І.І. Творы: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мінск, 1991; Тэн И. Философия искусства. М., 1996. *Э.С.Дубянецкі.*

**КУЛЬТУ́РНА-ТУРЫ́СЦКАЯ ЗО́НА**, тэрытарыяльнае ўтварэнне з помнікамі гісторыі, культуры, архітэктуры, археалогіі, прыроды, а таксама аб'ектамі абслугоўвання турыстаў, прызначанае для арганізацыі турысцкай дзейнасці насельніцтва. Уключае комплекс турысцкіх паслуг: аб'екты паказу і турысцкай інфраструктуры (транспарт, пражыванне, харчаванне, даведачна-інфармацыйная служба, гандаль, быт. паслугі, арганізацыя вольнага часу і інш.). У адпаведнасці з «Нацыянальнай праграмай развіцця турызму Рэспублікі Беларусь на 2011—15 гг.» фарміруюцца К.-т.з. «Пінскае Палессе», Гомельска-Веткаўская, Палеска-Тураўская, Жлобінская, Гродзенская, Слонімская і інш.

**КУЛЬТУ́РНАЯ АНТРАПАЛО́ГІЯ**, асобная галіна навуковых даследаванняў працэсу ўзаемаадносін чалавека і культуры. Як кірунак еўрап. навукі канчаткова сфарміраваўся ў апошняй чвэрці 19 ст. Пачатак культуралагічным даследаванням паклалі Э.Тайлар, Дж.Фрэзер, Дж.Лебак, Ю.Ліперт, Ф.Боас, К.Д.Кавелін, М.М.Кавалеўскі, М.І.Кулішэр, М.І.Крукоўскі і інш. Паняцце К.а. выкарыстоўваецца для параўнальнага аналізу культур і супольнасцей, навукі аб чалавецтве, якая імкнецца да абагульнення паводзін людзей і да самай поўнай магчымасці разумення разнастайнасці чалавецтва і культуры. Да ліку гал. праблем даследаванняў К.а. адносяцца пытанні, якія звязаны са станаўленнем чалавека як феномена культуры: працэсы акультурацыі і інкультурацыі; культурыраванне асн. інстынктаў чалавека; паводзіны чалавека; фарміраванне норм, забарон і табу, якія звязаны з уключэннем чалавека ў сістэму сацыякульт. адносін; будова цела чалавека ў сувязі з культ. асяроддзем; уплыў культуры на палавы дымарфізм, сям'ю, шлюб; станаўленне светаадчування і светапогляду чалавека і інш. Культураантраполагі больш арыентуюцца на параўнальныя і крос-культ. даследаванні розных культур у пэўныя гіст. эпохі. У ВНУ шэрага заходнееўрап. краін выкладаецца вучэбны курс «К.а.», створаны кафедры, навук.-даследчыя ўстановы і арг-цыі, якія даследуюць яе праблемы. У Беларусі замест тэрміна «К.а.» найб. часта ўжываюцца паняцці «этналогія» і «культуралогія». *Л.К.Кухто.*

**КУЛЬТУ́РНАЯ МАДЭРНІЗА́ЦЫЯ**, працэс укаранення комплексу інавацый у сац.-культ. сферу. У духоўным жыцці падчас К.м. атрымлівае прызнанне арыентацыя на рэформы і адмова ад ранейшых забарон на новаўвядзенні, ад прывязанасці да традыцый, якія страцілі актуальнасць. Аднак перамены не ахопліваюць усёй сукупнасці сац.-культ. рэгуляцыі, а прызнаюцца толькі ў функцыянальна неабходных галінах, звязаных з новымі дасягненнямі. К.м. — супярэчлівы працэс, які ўключае ў сябе барацьбу старога і новага, разбурэнне і стварэнне, сутыкненне розных ідэалаў, ідэй, каштоўнасцей, маст. кірункаў. Інтэнсіўнае засваенне суб'ектамі бел. нац. культуры новых каштоўнасцей, ідэй, норм і патэрнаў пачалося ў 2-й пал. 20 ст. і працягваецца да гэтага часу. Яно выклікана кардынальнымі зменамі ў сац.-паліт., эканам. і духоўным жыцці бел. грамадства. К.м. звязана таксама з пашырэннем міжкульт. камунікацый, глабалізацыяй, міграцыйнымі працэсамі, інфарматызацыяй сусветнай культ. прасторы.

*Літ.*: Евдокимова М.И. Последствия культурной модернизации в глобальном пространстве // Вестник Московского университета культуры и искусств. 2012. № 6; Красюк В.Ф. Модернизационные проекты и динамика культуры // Культура. Наука. Творчество: материалы IV Международной научно-практической конференции, Минск. 20—23 апреля 2010 года. Минск, 2011; Сергеева К.У. Модернизация общества и поиск новой культурной идентичности // Социально-гуманитарные знания. 2012. №5. *А.І.Смолік.*

**КУЛЬТУ́РНАЯ РЭВАЛЮ́ЦЫЯ**, сукупнасць пераўтварэнняў у сферы культуры як састаўная частка праграмы пабудовы сацыялізму ў СССР і інш. сацыяліст. краінах (за выключэннем Кітайскай Нар. Рэспублікі,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ